гэта адчуваецца ў XX стагоддзі, калі ў Беларусі ўзнік шырокі літаратурны рух. І менавіта неўміручыя творы вялікіх рускіх майстроў мастацкага слова дапамаглі беларускім пісьменнікам разабрацца ў складаных умовах рэчаіснасці, знаёмілі з багаццем і разнастайнасцю прыёмаў паэтычнай творчасці.

Гэтыя духоўныя адносіны вялікіх літаратур можна прасачыць на прыкладзе творчых адносін таленавітага паэта, класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча і рускага паэта, крытыка, грамадскага дзеяча Валерыя Брусава.

Максім Багдановіч быў адным з тых, хто з энтузіязмам працягваў ніці духоўнай сувязі паміж рускім і беларускім народамі. Багдановіч – чалавек велізарных здольнасцей, высокай адукаванасці, неабмежаваных творчых магчымасцей, «жывая энцыклапедыя разнастайных ведаў», як яго называлі. Дзейнасць Багда-новіча складаная, шматгранная і вельмі значная. Ён быў не толькі таленавітым паэтам, але і бліскучым майстрам публіцыстычнага слова, крытыкам і тэарэтыкам літаратуры. «Яго артыкулы ў гэтай галіне,– пісаў Я.Колас, -- здзіўляюць смеласцю думкі, глыбокім пранікненнем у сутнасць паэтычных твораў». Багдановіч з'яўляўся выразнікам поглядаў прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратачнай плыні ў беларускай літаратуры, прадстаўніком той часткі інтэлігенцыі, якая лічыла, што славянскія народы павінны звязваць вузы духоўныя. І Максім Багдановіч, як ніхто іншы, адчуваў гэту сувязь. У сваіх артыкулах ён неаднаразова падкрэсліваў агульнасць ўсходнееўрапейскіх народаў.

У артыкуле «Забыты шлях», напісаным у 1915 годзе, М.Багдановіч заклікаў беларускіх пісьменнікаў «уліць у нашу паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепей наталіць яе духоўную смагу і сапраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай народнай культуры».

У каго ж вучыўся сам Багдановіч, дзе чэрпаў тую духоўнасць, якой прасякнуты ўсе яго творы? Вядома, у свайго народа. А яшчэ ў лепшых прадстаўнікоў братніх культур. Так, напрыклад, высока цаніў М.Багдановіч рускага паэта Валерыя Брусава. Ён вызначаў прапагандысцкі, асветніцкі характар дзейнасці Брусава, яго нястомную працу як перакладчыка і эксперыментатара, высока цаніў яго паэтычнае майстэрст-ва. Менавіта Брусаў быў блізкім для Багдановіча паэтам, у якога ён вучыўся, за творчым майстэрствам якога заўжды ўважліва сачыў. Сувязь Багдановіча з Брусавым была не толькі па лініі тэм, стылістычных асаблівасцей і літаратурных інтарэсаў, але і па важнейшых тэарэтычных пытаннях. А самае галоўнае тое, што і Брусаў, і Багдановіч надавалі вялікае значэнне патэнцыялу паэтычнага вобраза, яго ўплыву на чытача.

Станоўча ацэньваючы рэалістычныя творы В.Брусава, М.Багдановіч працягвае традыцыі паэзіі рускага майстра ў сваіх творах. Менавіта гэтыя традыцыі паэзіі яднаюць вялікіх паэтаў.

Саладоўнікаў С.В.,
канд. філал. навук,
дацэнт

## НАВУКА, ЛІТАРАТУРА І НАВУКОВАЯ ФАНТАСТЫКА

Пісьменнікі, якія працуюць у жанрах навуковай фантастыкі, ствараюць творы ў адзінай паэтыцы: апісваюць будучыню, добрую ці дрэнную (утопія і антыўтопія), касмічныя цывілізацыі, ствараюць новы погляд на чалавека і чалавецтва. Навуковая фантастыка многа ўзяла ад рамантызму. А ў сярэдзіне XX стагоддзя ў навуковай фантастыцы ўзнік новы жанр -- «фэнтэзі», у ім сплавіліся казка і навука, міф і паданне, «гатычны раман» і гісторыя.

Мастакі, пісьменнікі, паэты з самых старых часоў цягнуліся да стварэння «структурно возможных» светаў. У гэтым напрамку ішло супрацьстаянне рэалістычнай літаратуры і той, што аддавала перавагу паэзіі, палёту ўяўлення, фантазіі. Дарэчы кажучы, неабходна адзначыць, што змадэляваныя светы іншы раз вельмі блізкія да рэальных. Напрыклад, карціны пекла ў паэме Дантэ «Боская камедыя». Але свет, у якім мы існуем, ці, як лічаць некаторыя філосафы, у які мы «закінуты», мы называем «светам нармальным», або «светам рэальным».Вобразы яго адпавядаюць рэчаіснасці. Праўда, другія філосафы (напрыклад, Д.Берклі), сцвярджаюць, што свет і ўсё ў ім наогул рэальна толькі ў чалавечых адчуваннях і існуюць пастолькі, паколькі гэты свет намі ўспрымаецца.

У рэалістычным расказванні малюнкі рэальнага свету па сутнасці спрачаюцца з фотакарткай і самой рэчаіснасцю. Канешне, сутнасць большасці літаратурных сюжэтаў так ці гэтак ідзе ад рэальнасці, ад жыцця і яго праблем, яго канфліктаў, сітуацый. Дзейнічае і катэгорыя выпадковасці: «Што здарылася б, калі б у Францыі XIX стагоддзя на самой справе існаваў Расціньяк або нехта, па прозвішчу Монтэ-Крыста, аказваў уплыў на курсы парыжскай біржы з дапамогай аптычнага тэлеграфа?» Тэма прататыпаў -- асобная тэма.

Істотнае адрозненне навуковай фантастыкі ад рэалістычнай прозы заключаецца у тым, што яе свет, вобразы, сітуацыі (хаця і не ўсе) сапраўды «структурна» адрозніваюцца ад свету рэальнага. Паэтыка навуковай фантастыкі карыстаецца сваёй логікай. Скажам, аўтар можа задацца пытаннем: «Што б зрабілася, калі б у нейкім свеце, які мы лічам нармальным, пайшлі б з'явы іншай логікі, іншых законаў прыроды?»

У рэалістычных творах апісваюцца і абыгрываюцца тыя механізмы, якія створаны людзьмі ў працэсе будаўніцтва жыцця на планеце Зямля. Але ў думках, ма-рах людзі могуць парушаць парадак ці нават і самыя законы прыроды. Гэта мы бачым у казках,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міфах, а зараз і ў творах навуковай фантастыкі. Гэтыя творы і рэалістычная літаратура адрозніваюцца паміж сабою тым, што вобраз «структурно возможного» свету ўсё ж такі адрозніваецца ад свету рэальнага. Тэрмін «структурны» патрэбна ўспрымаць шырока, але ў першую чаргу там, дзе могуць быць выяўлены сістэма, структура, састаўныя часткі з самастойнымі функцыя-мі кожнай часткі. Гэта можа быць і касмалагічная структура, сацыяльная, біялагічная. Напрыклад, свет у байках (Эзоп, Крылоў, Крапіва) структурна адрозніваецца ад свету рэальнага ў заалагічных адносінах. «Утопія» Т.Мора, «Горад Сонца» Т.Кампанелы -- структуры сацыяльныя.

Вельмі складанае становішча з творамі навуковай фантастыкі, якія мадэлююць іншыя цывілізацыі. Тут узнікае адрозненне адразу і сацыяльнае, і фізічнае, і біялагічнае (напрыклад, у рамане Урсулы ле Гуін «Левая рука цемры»).

Значнае месца ў паэтыцы твораў навуковай фантастыкі займаюць меркаванне, прагноз, прадбачанне. Выкарыстоўванне навуковых поглядаў, гіпотэз, проста навуковага матэрыялу аўтаматычна вядзе да таго, што ўзнікае тэма вынікаў прымянення навуковага адкрыцця ці вынаходніцтва. Узнікае моцная сцэпка: навука--тэхніка--літаратура. А паколькі апісанне таго, чаго яшчэ няма, уваходзіць у сферу навуковай фантастыкі, то тут і пачынае працаваць яе паэтыка.

Няфёдаў В.В.,
прафесар

## ЧЕРТЫ ПОЭТИЧЕСКОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОСТИ Б.ОКУДЖАВЫ

Булат Окуджава пришёл к русскому и белорусскому читателю в 50-е годы. С того времени и по сей день его лирика пользуется большим успехом у самых разных людей: представителей художественной, научно-технической интеллигенции, у студентов, рабочих, жителей села.

50 -- 60-е гг. -- время яркого расцвета поэзии. Гуманистическим пафосом и публицистической направленностью в утверждении идеалов красоты проникнуты стихи поэтов старших поколений -- Анны Ахматовой, Бориса Пастернака, Николая Заболоцкого, Александра Твардовского, Ильи Сельвинского, Владимира Луговского, Ярослава Смелякова; поэтов военного и послевоенного поколений -- Евгения Винокурова, Глеба Горбовского, Владимира Соколова, Сергея Викулова, Евгения Евтушенко, Андрея Вознесенского, Роберта Рождественского, Николая Рубцова. К этим последним принадлежит и Булат Окуджава. Читатели тогда говорили о «второй весне» старых поэтов и о влекущей свежести, новизне переживаний поэтической молодёжи.

Окуджава пишет без ложного пафоса. Он раскрывает поэзию чувств, близких и понятных людям вне зависимости от их национальности. Он любит краски родной природы. Он не мыслит жизни без внимания к простым людям. Он убежден в том, что гражданское мужество украшает человека.

Окуджава раскрывает душу и как исполнитель песен: для стихов он находит безыскуственные и хватающие за краешек сердца мелодии. Он прекрасно владеет гитарой, выступает с эстрады. В его облике, манере исполнения есть своеобразный притягательный шарм. Он не пишет стихов о космосе, о ракетах или о величии грандиозных социально-экономических строек, зато он знает цену смутной улыбки жизни, её горечи, искрометной пьянящей радости, цену человеческой солидарности. Он знает тайну слов и силу надежды.

Итак, Окуджава -- признанный лирик. Поэтому стоит разобраться поконкретнее в читательских впечатлениях от его стихов.

Чувствам поэта открываешь сердце, впитываешь их: пусть несёт тебя лирическая волна. Испытываешь настроения Окуджавы, и жизнь идёт, как стихи.

Его настроения? Нежность в любови к Родине, как в «Песенке об Арбате». Тот самый чеховский Арбат, как он дорог ему! Окуджава -- его частица, этого тёплого родного мира. Поэт пленён обликом Арбата, взволнованно вдумывается в звучание дорогого слова: «Ты течёшь, как река. Странное название! И прозрачен асфальт, как в реке вода».

Этот чудесный образ мог родиться только от большого и задушевного чувства. При том в образе нет нарочитости, он подсказан визуальными впечатлениями, сжатыми с мастерством настоящего лакониста. Сравните в «Улице моей любви»: «...где асфальт прозрачен просто, голубеет, как январский наст...»

Течёт «песенка»: «Ах, Арбат, мой Арбат, -- ты -- моё призвание. Ты -- и радость моя, и моя беда. Пешеходы твои, люди не великие, каблуками стучат, по делам спешат».

Не хватает слов для любви! И вот поэт придумал необыкновенное слово, передающее сердечный трепет: «Ах, Арбат, мой Арбат, Ты -- моя религия...»

Слова об Арбате «Ты -- моя религия» вызвали раздражение критиков. Действительно, пример уникального словоупотребления. Так воплощается эмоция молитвенной любви к родному дому: никакой воспалённости, одна простота. Поэт избежал традиционных определений любви к Москве: Москва -- великая, Москва -- древняя...

Таким образом, Окуджаву отличают и подлинный лиризм, и редкая в наше время дисциплина письма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ